## Секция 11

# ПРАВО И ЭКОНОМИКА: ПРОБЛЕМЫ СОВРЕМЕННЫХ ИССЛЕДОВАНИЙ

***В.В. Варабей, У.В. Арлова***
*Навуковы кіраўнік — кандыдат гістарычных навук В.М. Лянцэвіч*
*БДЭУ (Мінск)*

## РЭЛІГІЙНАЯ ПАЛІТЫКА ПОЛЬСКІХ УЛАД У АДНОСІНАХ ДА ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 1921–1939 ГГ.

Па выніках польска-савецкай вайны 1919–1920 гг. заходняя частка сучаснай Беларусі адыйшла ў склад Польшчы. Беларускія землі сталі часткай дзяржавы, дзе дамінаваў каталіцызм, што спрычыніла напружанасць у міжканфесійных і нацыянальных адносінах. У палітычнай сістэме Польскай дзяржавы дамінавалі права-цэнтрысцкія партыі, якія імкнуліся да асіміляцыі славянскіх меншасцей. Гэта абумовіла неабходнасць фарміравання рэлігійнай палітыкі, накіраванай на падпарадкаванне праваслаўнай царквы дзяржаўным інтарэсам [1, с. 79].

У міжваенны перыяд праваслаўная царква разглядалася як інструмент русіфікацыі, што абвастрала адносіны паміж праваслаўнымі вернікамі і польскімі ўладамі. У 1920-х гг. не існавала адзінай дзяржаўнай стратэгіі: некаторыя палітыкі выступалі за ліквідацыю праваслаўнай царквы, іншыя імкнуліся падпарадкаваць яе дзяржаве. Канстытуцыя Другой Рэчы Паспалітай 1921 г. фармальна гарантавала правы нацыянальных меншасцей: поўная ахова жыцця, роўнасць перад законам, права на свабоду веравызнання (арт. 95, 96, 101, 111–116) [2]. У Рыжскай дамове быў артыкул, якім прадугледжвалася падтрымка свабоднага развіцця культуры, выканання рэлігійных абрадаў, выкарыстанне роднай мовы іншымі народамі, якія насялялі Польшчу. Артыкул дэклараваў: «Польшча дае асобам рускай, украінскай і беларускай нацыянальнасьцяў усе правы, якія забясьпечваюць свабоднае разьвіццё культуры, мовы і выкананьне рэлігійных абрадаў…» [3, с. 17].

Аднак на практыцы рымска-каталіцкая царква займала прывілеяванае становішча. У 1922 г. былі выпушчаны «Часовыя правілы аб адносінах урада да Праваслаўнай царквы» у якасці часовага прававога акта, які павінен быў разабрацца з пытаннямі рэгулявання адносін царквы і акрэсліць асновы для дзейнасці дзяржаўнай адміністрацыі ў дачыненні да царквы да моманту прыняцця закона, як гэта прадугледжвала Канстытуцыя. Аднак яны сустрэлі крытыку, паколькі, у адпаведнасці з арт. 115 Канстытуцыі, рэгуляванне адносін паміж дзяржавай і царквой магло адбывацца толькі заканадаўчым шляхам пры паразуменні з юрыдычнымі прадстаўнікамі царквы, якія рэгулявалі дзейнасць царквы да прыняцця закона.

У 1922 г. польскія ўлады ініцыявалі стварэнне незалежнай праваслаўнай царквы з мэтай аслаблення ўплыву Маскоўскага патрыярхата. Сабор епіскапаў у Варшаве абвясціў аўтакефалію, якую ў 1923 г. зацвердзіў Канстанцінопальскі патрыярх Мялецій IV [4, арк. 19–20]. Гэта выклікала ўнутраны раскол.

Паралельна польскія ўлады праводзілі палітыку рэвіндыкацыі, вяртаючы каталіцкай царкве маёмасць, перададзеную праваслаўным у Расійскай імперыі [5, с. 9]. У 1918–1924 гг. каталікі атрымалі назад каля 400 храмаў, у 1929 г. было ініцыявана 755 судовых працэсаў, у тым ліку 614 супраць праваслаўных кансісторый. У Віленскай епархіі планавалася адабраць 71 храм, у Гродзенскай — 159, у Палескай — 248 [6, с. 89; 93]. У 1937–1939 гг. рэвіндыкацыя суправаджалася фізічным знішчэннем праваслаўных святынь [7, с. 44].

Храмы адымаліся не толькі на падставе рашэння грамадзянскіх улад, але і самавольна, пры актыўным садзейнічанні каталіцкага кліру. У другі перыяд рэвіндыкацыі (1925–1929 гг.) гвалтоўныя дзеянні каталікоў знаходзілі адпор, у тым ліку і з ужываннем зброі. За гэтыя гады праваслаўныя пазбавіліся не менш за 14 цэркваў і 2 капліц. Паўсюднае абурэнне праваслаўнага насельніцтва насцярожвала ўрадавыя колы, таму 24 мая 1924 г., у сувязі з узмацненнем міжканфесійнай непрыязнасці, Палітычны Камітэт Савета міністраў пастанавіў устрымлівацца ад рэвіндыкацыі праваслаўных храмаў да прыняцця юрыдычных законаў [8].

Такім чынам, праваслаўная царква на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1917–1939 гг. падвяргалася пастаяннаму ціску з боку польскіх улад, якія імкнуліся абмежаваць яе дзейнасць і асіміляваць праваслаўнае насельніцтва. Канстытуцыйныя правы на свабоду веравызнання сістэматычна парушаліся. Замест сацыяльнага згуртавання польскія ўлады выкарыстоўвалі рэпрэсіі, уключаючы рэвіндыкацыю святынь і паланізацыю вернікаў, чым неўзабаве скарысталіся знешнія палітычныя сілы — спачатку ў Польшчы, а пазней і ў СССР.

### Крыніцы


1. *Kalina, M.* Polonizacja Cerkwi prawosławnej w województwie białostockim (1918–1939) / M. Kalina // Białoruskie Zeszyty Historyczne. — 1995. — № 2 (4). — S. 74–105.

2. Конституция Польской Республики 17 марта 1921 года : с изм. и доп., принятыми по закону 2 авг. 1926 г. // Конституции. — URL: https://worldconstitutions.ru/?p=742 (дата обращения: 05.05.2025).

3. Рыжская дамова // Спадчына. — 1993. — № 4. — С. 12–23.
4. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. — Ф. 2059. Воп. 1. Спр. 14.
5. *Ганчар, А.И.* Деятельность Римско-католического костела по сохранению позиций католицизма на территории Беларуси (1864–1905 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / А.И. Ганчар ; НАН Беларуси, Гос. науч. учр. «Институт истории». — Минск, 2007. — 21 с.
6. *Mironowicz, A.* Rewindykacja prawosławnych obiektów sakralnych w II Rzeczypospolitej / A. Mironowicz // Białoruskie Zeszyty Historyczne. — 2004. — № 21. — S. 83–103.
7. *Srokowski, K.* Sprawa narodowościowa na kresach wschodnich / K. Srokowski. — Kraków : Druk. «Czasu», 1924. — 56 s.
8. *Костюк, В.* Ревиндикация православных храмов на Полесье (20–30-е гг. XX в.) / Иеродиакон Василий Костюк // СОБОР.by. — URL: https://sobor.by/6km4tenia_kostjuk.htm (дата обращения: 08.04.2025).

***К.Д. Вильневская, А.В. Савинцева***
*Научный руководитель — кандидат юридических наук И.П. Манкевич*
*БГЭУ (Минск)*

# К ВОПРОСУ О РАЗВИТИИ ЭКОЛОГИЧЕСКОГО ТУРИЗМА В КОНТЕКСТЕ ЗЕЛЕНОЙ ЭКОНОМИКИ

Тенденция признания мировым сообществом важности зеленой экономики является позитивным сигналом, указывающим на то, что многие государства приняли и поддерживают модель экономического развития, основанную на зеленых принципах.

Переход к зеленой экономике является не только ответом на экологические вызовы, но и стратегически важным направлением развития Республики Беларусь, обеспечивающим снижение негативного воздействия на окружающую среду.

В национальной правовой системе под «зеленой экономикой» понимается «модель организации экономики, направленная на достижение целей социально-экономического развития при существенном сокращении экологических рисков и темпов деградации окружающей среды» [1].

Во многих странах, включая Республику Беларусь, зеленая экономика становится реальностью, что выражается в развитии рынка экосистемных услуг, под которыми понимаются «обеспечивающие, регулирующие, поддерживающие, культурные и иные услуги, которые позволяют получать обществу выгоды в экологической, экономической и социальной сферах в результате сохранения, восстановления и устойчивого функционирования естественных экологических систем» [2].

В рамках настоящего исследования следует более подробно остановиться на культурных экосистемных услугах, которые представляют собой нематери-